«ВАНДРОЎНІК ДАЛЬНІ, ВОЛЬНАСЦІ ЗМАГАР»

Да 215-годдзя з дня нараджэння А. Міцкевіча



Склаў Іосіф КАРПЫЗА, г. Ляхавічы.

Па гарызанталі: 7. Апісанне знешнасці літаратурнага персанажа. **8**. Падраздзяленне ў парыжскім Калеж дэ Франс, якое ў 1841—44 гадах узначальваў А. Міцкевіч. **12**. Метад дзейнасці падпольнага студэнцкага згуртавання, створанага ў Віленскім універсітэце Адамам і яго сябрамі. **15**. Верш, які паэт прысвяціў рускаму перакладчыку яго «Крымскіх санетаў» Івану Казлову. **16**. Галоўная дзеючая асоба паэмы «Гражына», названай аўтарам літоўскай аповесцю. **17**. Ганаровае званне, якога быў удастоены ў Чылі блізкі сябар Адама, вядомы вучоны-геолаг. **20**. Пісьмовая або вусная перадача сваімі словамі зместу твора. **21**. Арыгінал аўтарскага тэксту. **22**. Прыватнаўласніцкі герб, якім карыстаўся шматлікі род Міцкевічаў. **23**. Гандлёвая мясціна, куды ў вольны час любіў наведвацца з маладымі сябрамі Адам. **26**. Слоўнікавы склад твора. **27**. Прыхільнік навукі ў студэнцкай суполцы, якая па прапанове Міцкевіча адначасова мела на мэце падрыхтоўку да змагання за вызваленне Бацькаўшчыны. **31**. Ідэйна-эмацыянальнае асэнсаванне, строй пачуццяў у творах паэта. **32*.** Уступ гістарычнай аповесці «Конрад Валенрод». **33*.** Імя філамата Адынца, які па задуме Адама дапісаў трэцюю і чацвёртую часткі яго балады «Тукай». **37**. Навучальная ўстанова ў швейцарскай Лазане, дзе вядомы паэт стаў прафесарам лацінскай літаратуры. **39*.** Адзін з санетаў А. Міцкевіча. **40*.** Твор, што выйшаў у свет асобным накладам.

Па вертыкалі: 2. Эміграцкае фарміраванне добраахвотнікаў, створанае Адамам у Турцыі для барацьбы з царскай Расіяй. **3**. Англійскі паэт, чые словы польскі класік узяў у якасці эпіграфа да балады «Рамантычнасць». **4**. Транспарт, на якім у 1829 годзе А. Міцкевіч адправіўся ў незваротную эміграцыю. **5**. Дробны друкарскі шрыфт. **9**. Вольны паляўнічы — персанаж верша, створанага паэтам пад уражаннем папулярнай оперы нямецкага кампазітара К. Вебера. **10*.** Заключная частка балады «Рыбка», дзе адбываецца трагічная развязка сюжэта — пакаранне пана за падманутую ім дзяўчыну. **11*.** Друкаванае перыядычнае выданне «Польскі пілігрым», якое рэдагаваў за мяжой А. Міцкевіч. **13*.** Вядомая польская піяністка і кампазітарка, гаспадыня літаратурнага салона, куды неаднойчы наведваўся Адам. **14*.** Упэўненасць паэта ў перамозе народа за сваё вызваленне. **18*.** Кароткі запіс пра каноплі, што склаў адну з частак шостай кнігі паэмы «Пан Тадэвуш». **19*.** Беларускі перакладчык паасобных твораў польскага класіка. **24*.** Адна з прафесій А. Міцкевіча. **25*.** Слупок тэксту ў кнізе, часопісе, газеце. **28*.** Балада, перакладзеная на рускую мову А. Пушкіным. **29*.** Горная сістэма ў Заходніх Карпатах, вядомая ваданадам, што носіць імя славутага паэта. **30*.** Маскоўскі губернатар, у канцылярыі якога ў 1825 годзе Адам атрымаў пасаду. **34*.** Адзін з ранейшых даследчыкаў творчасці Міцкевіча. **35*.** Кіраўнік фізіка-матэматычнага факультэта Юзаф Міцкевіч, што паспрыяў паступленню Адама на вучобу, даў яму прытулак.

Па дугах: 1. Трэцяя па ліку кніга паэта, напісаная ў Адэсе. **6.** Горад у Польшчы, дзе ў сутарэннях кафедральнага сабора Вавельскага замка пахаваны прах А. Міцкевіча. **36.** Герой паэмы «Дзяды», які імкнуўся зрабіць шчаслівым увесь свет. **38.** Націск у слове.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 7. Партэт. 8. Кафедра. 12. Канспіраціяя. 15. «Фарыс». 16. Літаво. 17. Гроэй. 20. Пераказ. 21. Рукапіс. 22. «Пораін». 23. Базар. 26. Лекіка. 27. Шлямат. 31. Пафос. 32. Пачатак. 33. Антон. 37. Універсітэт. 39. «Дванаццаць». 40. Выдаванне. **Па вертыкалі:** 2. Атрад. 3. Шэкспір. 4. Пароход. 5. Петыт. 9. Страпеці. 10. Фінал. 11. Часопіс. 13. Шымановіка. 14. Перакананне. 18. «Натэкі». 19. Лужаніи. 24. Педа-гог. 25. Калонка. 28. «Варвода». 29. Тэрпы. 30. Раніцын. 34. Ніцін. 35. Дажан. **Па дугах:** 1. «Санеты». 6. Краків. 36. Конрад. 38. Акцэнт.

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 25 снежня. Месяц у сузор'і Цяльца.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.28	16.51	7.23
Віцебск —	9.25	16.33	7.08
Магілёў —	9.18	16.41	7.23
Гомель —	9.06	16.46	7.40
Гродна —	9.41	17.08	7.27
Брэст —	9.33	17.17	7.47

Імяніны

Пр. *Данілы, Івана, Лукі.*
К. *Евы, Ірмы, Эвеліны, Адама, Рыгора.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Пакуль я галіўся ў ваннай, жонка ў мяне нешта спытала, сама сабе адказала, сама з сабой пасварылася — і з ваннай я выйшаў разведзеным чалавекам.

Дзяўчынка закопвае ямку пад дрэвам суседзяў.

— Што закопваеш?

— Майго хамячка.

— Нешта ямка вялікая для хамяка.

Дзяўчынка кінула апошнюю жменю зямлі:

— Вялікая таму, што мой хамяк унутры вашага ката!

caricatura.ru

■ Помніць, шанаваць, ганарыцца

ПЕСНІ-ПОМНІКІ...

Яны ствараюцца заўсёды і паўсюль на свеце. Іх складваюць, каб уславіць гераічныя справы суайчыннікаў, каб ушанаваць святыя імёны тых, хто самаахвярна дзейнічаў дзеля свабоды роднай зямлі і яе росквіту. Асабліва шмат такіх твораў узнікае ў гістарычна вызначальны для краіны, драматычна-трывожны час.

Жыццё Канстанціна Заслонава стала легендай і асветлена ў вершах і песнях. Ён карыстаўся вялікай павагай сярод падпольшчыкаў і партызан з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Смерць партызанскага камандзіра выклікала незвычайны патрыятычны і паэтычны ўздым. У песнях, якія хутка фалькларызаваліся, вымалёўваўся вобраз мужнага і ўмелага кіраўніка, народнага змагара, перадаваліся боль і смутак яго паплечнікаў.

Народную песню, якая так і называецца «Песня пра Заслонава», у 1946 годзе занатаваў нястомны фалькларыст Генадзь Цітовіч ад жыхароў мястэчка Бягомль Мінскай вобласці. Яна нарадзілася ў шэрагах адважных мсціўцаў адразу пасля гібелі камандзіра, перадавалася па партызанскіх атрадах, пашыралася ў варыянтах. Асобныя строфы песні нагадваюць вершаваныя радкі, змешчаныя ў газеце «Віцебскі рабочы» 10 сакавіка 1943 года. Пазней апрацоўку мелодыі зрабілі А. Багатыроў, Я. Яраславенка, а пачатак песні адрэдагаваў А. Русак.

ПЕСНЯ ПРА ЗАСЛОНАВА

Народная песня

На магіле ружы расцвітаюць,
Шэпча бэз над кветкамі вяргінь,



А ў магіле спіць герой савецкі —
Партызан Заслонаў Канстанцін.

Не салоўка голасам пявучым
Над ракой калыша ціхі гай,
Гэта мы яму спяваем песню
Пра любімы, родны, вольны край.

У дрымучых у лясах аршанскіх
Гэтай песні ён не даспяваў.
Ад смяротнай кулі ад фашысцкай
За Радзіму вольную ён паў.

Беларусь, ты Бацькаўшчына наша,
Ўдаль і ўшыр прасторам ты лягла,
Кветкай яркай, кветкаю прыгожай
Між рэспублік вольных расцвіла.

Ой, з-за лесу-бору, па-над хатай,
Ясна свеціць сонца цераз тын.
Мы табе пяём сягоння славу,
Наш герой — Заслонаў Канстанцін.

Апошняе двухрадкоўе кожнай страфы спяваюцца двойчы.

У пасляваенны час асаблівую папулярнасць набыла «Песня пра Заслонава», якую напісалі паэт Анатоль Астрэйка і кампазітар Уладзімір Алоўнікаў. Яна натхнёна выконвалася на сцэнічных пляцоўках, часта гучала па радыё. Светлая мелодыя і шчырыя словы ўслаўляюць мужнасць і самаахвярнасць народнага героя, крылата-ўзнёсла абуджаюць памяць нашчадкаў, напаўняюць іх душы грамадзянска-патрыятычнымі пачуццямі.



ПЕСНЯ ПРА ЗАСЛОНАВА

Верш Анатоля Астрэйкі Музыка Уладзіміра Алоўнікава

Як узыдзе сонца сінім
раннем веснім,
Як развее над зямлёй туман,
Над краінай пралятае песня,
Песня баявая партызан.

І звіняць, гудуць на ўсю
нашу дзяржаву
Гарадоў і вёсак галасы —
Канстанцін Заслонаў —
наша слава,
Беларусі-партызанкі сын.

У сцягах Радзімы
яркім промнем ззяе
Над усёй савецкаю зямлёй
Доля твая, справа баявая,
Мужны, легендарны наш герой.

Першая страфа і апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.398. Індэкс 63850. Зак. № 5518.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 снежня 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12